*УДК 378.147:811.161.3:378.147:821.161.3*
***А. М. Воінава, А. М. Палуян***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ПРАФЕСІЙНА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ СКЛАДНІКІ ПАДРЫХТОЎКІ НАСТАЎНІКАЎ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

На філалагічным факультэце Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны шмат гадоў вядзецца падрыхтоўка па спецыяльнасцях гуманітарнага профілю 1-21 05 01 Беларуская філалогія і 1-21 05 02 Руская філалогія з напрамкам “літаратурная рэдакцыйная дзейнасць” і атрыманнем кваліфікацы “Філолаг. Выкладчык беларускай / рускай мовы і літаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік”. Выпускнікі дадзеных спецыяльнасцей працуюць не толькі ва ўстановах сярэдняй і вышэйшай адукацыі, але і на тэлебачанні і радыё, у рэдакцыях, інфармацыйных агенцтвах, прэс-службах, выдавецтвах, бібліятэках, музеях і г.д. Але паколькі значная колькасць выпускнікоў ажыццяўляе сваю прафесійную дзейнасць менавіта як настаўнікі беларускай / рускай мовы і літаратуры, то ў вучэбны план спецыяльнасцей уключаны дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай / рускай мовы”, “Методыка выкладання беларускай / рускай літаратуры”, “Інфармацыйныя тэхналогіі ў філалогіі”. У раздзеле дысцыплін спецыялізацыі з 2021 года прысутнічае асобны прафесійна-метадычны модуль, у які ўваходзяць такія дысцыпліны, як “Функцыянальная скіраванасць навучання беларускай мове ў агульнаадукацыйных установах”, “Фарміраванне навыкаў маўленчай дзейнасці навучэнцаў на ўроках беларускай мовы”, “Асновы лінгвадыдактыкі”, “Інавацыі і традыцыі ў выкладанні рускай мовы”, “Інавацыйныя тэхналогіі навучання беларускай літаратуры”, “Актуальныя праблемы навучання беларускай літаратуры ва ўстановах сярэдняй адукацыі”, “Інтэграцыйны падыход у літаратурнай адукацыі”, “Дыялектыка традыцый і інавацый у навучанні літаратуры”.

У 2019 годзе на нашым факультэце адкрыта падрыхтоўка па спецыяльнасцях I ступені вышэйшай адукацыі профілю А “Педагогіка” напрамку 02 “Педагогіка падлеткавага і юнацкага ўзросту” з атрыманнем кваліфікацыі “выкладчык”. У 2020 годзе адбыўся першы набор на спецыяльнасць 1-02 03 04 Руская мова і літаратура. Замежная мова (англійская), а ў 2021 годзе на спецыяльнасці 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) і 1-02 03 04 Руская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская).

Паколькі адной з мэтаў падрыхтоўкі будучых настаўнікаў мовы і літаратуры з’яўляецца “фарміраванне прафесійных кампетэнцый, якія дазваляюць арганізаваць цэласны адукацыйны працэс з улікам сучасных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый” [1, с. 6], то ў вучэбны план уключаны такія курсы, як “Методыка выкладання беларускай / рускай мовы”, “Методыка выкладання беларускай / рускай літаратуры”, “Методыка выкладання замежнай мовы”, “Інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі”, “Педагагічныя тэхналогіі”, “Інавацыйныя практыкі ў адукацыі”, “Актуальныя аспекты методык выкладання спецыяльных дысцыплін”, “Медыяпедагогіка і лічбавая дыдактыка”.

Значная ўвага надаецца псіхолага-педагагічнай падрыхтоўцы будучых настаўнікаў. Ужо на першым курсе студэнты вывучаюць модуль “Адукацыя і асоба ў сучасным соцыуме”, які ўключае такія дысцыпліны, як “Асновы псіхалогіі і педагогікі”, а таксама “Сацыяльную псіхалогію”. На другім курсе далучаецца падрыхтоўка па педагогіцы і ўзроставай і педагагічнай псіхалогіі. На трэцім курсе студэнты знаёмяцца з арганізацыяй работы з адоранымі дзецьмі (“Асновы праектнай дзейнасці”) і навучэнцамі з асаблівасцямі развіцця (“Інклюзіўная адукацыйная практыка”, “Псіхалагічная бяспека ў школе”, “Прафілактыка дэвіянтных паводзін”), паглыбляюць сваю юрыдычную граматнасць (“Прававыя асновы дзейнасці ўстановы адукацыі”, “Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю”).

Адзін з самых важных складнікаў падрыхтоўкі будучага настаўніка – практыка. Студэнты філалагічнага факультэта спецыяльнасцей “Руская мова і літаратура. Замежная мова (англійская / кітайская)” і “Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)” маюць дзве вучэбныя (азнаямленчая і вучэбна-пошукавая на 1 і 2 курсах) і тры вытворчыя практыкі (педагагічная, пераддыпломная і педагагічная ў выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі на 3 і 4 курсах). Азнаямленчая і вучэбна-пошукавыя практыкі накіраваны на асваенне студэнтамі вопыту прафесійнага ўзаемадзеяння з вучнямі, педагогамі, бацькамі ў розных сферах жыццядзейнасці, фарміраванне ўмення будучых педагогаў распрацоўваць і рэалізоўваць разнастайныя праекты, акцыі, праграмы. Цікавай формай правядзення вучэбна-пошукавай практыкі з’яўляюцца вучэбна-даследчыя заданні: выявіць спецыфіку выкарыстання нетрадыцыйных урокаў і сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай / рускай /замежнай мовы і літаратуры; выявіць спецыфіку выкарыстання інтэрактыўных тэхналогій на ўроках беларускай / рускай /замежнай мовы і літаратуры; выявіць спецыфіку выкарыстання нагляднасці і ЭСН на ўроках беларускай / рускай /замежнай мовы і літаратуры; распрацаваць тэставыя і творчыя заданні па беларускай / рускай /замежнай мове і літаратуры.

Засваенне комплексу вышэйпералічаных дысцыплін, праходжанне вучэбных і вытворчых практык дазволіць нашым выпускнікам выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання, эфектыўна

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

рэалізоўваць выхаваўчую і карэкцыйна-педагагічную дзейнасць, ажыццяўляць прафілактыку дэвіянтных паводзін падлеткаў, папярэджваць і пераадольваць школьную непаспяховасць, арганізоўаць цэласны педагагічны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый.

**Літаратура**

1. Образовательный стандарт высшего образования ОСВО 1-02 03 03 – 2013. Утвержден и введен в действие постановлением Министерства образования Республики Беларусь от 30.08.2013 № 88. – Минск : 2013. – 27 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ